
Падсвечнік-ліхтарык з апельсіна

Аўтар: Анна Віткоўская
15.11.2009 21:13



Часам штосьці добрае і цікавае можна зрабіць з зусім нечаканых рэчаў. Палова апельсіна, старая газета, некалькі фламастэраў. Некалькі рухаў і атрымліваецца… выдатны падсвечнік.

А для гэтага спатрэбіцца: апельсін, нож, газета, каўпачкі ад ручак ці фламастэраў, плывучая свечка ў алюміневай ёмістасці.

1. Апельсін разразаем папярок. Калі ён - невялікага памеру, то можна падзяліць яго на дзве няроўныя часткі, а нам спатрэбіцца - большая.
2. Акуратна выцісніце з апельсіна сок. Затым асцярожна лыжкай выдаліце мякаць.
3. Пры дапамозе каўпачкоў ад фламастэраў, зрабіце ў лупіне апельсіна дзірачкі. Для гэтага пакладзіце скурку апельсіна на роўную паверхню і з ўнутранага боку лупіны націсніце на яе каўпачком. Папрасіце бацькоў дапамагчы вам акуратна, каб не разарваць скурку апельсіна, выразаць нажом квадрацікі, трохкутнікі і зорачкі. Як размясціць зорачкі і квадрацікі - хай вам падкажа ваша фантазія.
4. Калі дзірачкі будуць гатовыя, напакуйце выраб газетай, выпрастайце форму. Каб падсвечнік хутчэй высах, яго можна памясціць на батарэю, літаральна на адзін дзень. Назаўтра газету трэба будзе выняць.
5. Ну што ж, а зараз пастаўце ўнутр выраба плывучую свечку ў алюміневай ёмістасці, запаліце яе і атрымлівайце асалоду ад сузірання прыгожага запаленага ліхтарыка. *Ж адаем вам творчых поспехаў!*